Раскажыце, як у вашай сям'і адзначаюцца дні нараджэння. Якія падарункі вы рыхтуеце сваім родным? Чаму людзі святкуюць дні нараджэння? Паспрабуйце назваць дні нараджэння вашых родных і блізкіх людзей. Чаму, на вашу думку, патрэбна абавязкова памятаць іх даты нараджэння?



## Дзень нараджэння

*Васіль Вітка*



Прыемна, калі людзі помняць твой дзень нараджэння, віншуюць цябе, жадаюць здароўя, поспехаў.

А ты ці помніш дні нараджэння сваіх родных і блізкіх: маці, бацькі, бабулі, дзядулі, братоў і сясцёр?

Колькі чалавек у сям'і — столькі і дзён нараджэння. У гэты дзень дорага кожнаму тваё віншаванне.

Прыемна будзе, калі ты падрыхтуеш і падарунак — кветкі, якія ты вырасціў, малюнак або рэч, зробленую сваімі рукамі, нарэшце, добрую адзнаку ў гэты дзень у школе. Непрыгожа прасіць у маці, у бацькі, дзядулі, бабулі грошай, каб купіць ім падарунак.

Дзень нараджэння — сямейнае свята. Не трэба абвяшчаць усім і кожнаму, калі ў цябе дзень нараджэння. Блізкія табе людзі і твае сябры самі помняць, калі ты нарадзіўся.

Добры звычай саджаць дрэва ў адзнаку якой-небудзь важнай падзеі ў сям'і. Хто дрэва пасадзіў — дабро людзям зрабіў. Заўваж, што прыказка гаворыць: зрабіў дабро не толькі сабе, а людзям, многім людзям. Дрэвы ўпрыгожваюць жыццё цэлых пакаленняў.

Вось ты пайшоў у школу. Пасадзіў дрэўца ў сваім ці ў школьным садзе або на вуліцы ля свайго дома. Ты расцеш, і дрэва тваё расце. Нездарма многія дрэвы маюць свае імёны: дзедава груша, маміна яблыня, татаў клён, Іванава вішня.

1. Якія падарункі пісьменнік рэкамендуе дарыць імянінніку? Чаму пажадана рабіць іх сваімі рукамі?
2. Чаму не трэба абвяшчаць усім пра свой дзень нараджэння? Прачытайце.
3. Растлумачце сэнс прыказкі «Хто дрэва пасадзіў — дабро людзям зрабіў».
4. Як бы вы сфармулявалі галоўную думку гэтага твора?
5. Прыгадайце, ці садзілі вы дрэвы, кусты, кветкі. З якой нагоды вы гэта рабілі? Хто быў ініцыятарам пасадкі? Хто вам дапамагаў?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі